*Дз.А. Доўгаль*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ НАВУЧАННЯ Ў ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ» НА ПЕДАГАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ МДУ ІМЯ А.А. КУЛЯШОВА

Адной з дысцыплін, якая распачынае лінгвістычную падрыхтоўку студэнта па дадатковай спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» на педагагічным факультэце, з'яўляецца «Практыкум па беларускай мове». Ён выкладаецца на першым курсе, калі студэнты яшчэ не валодаюць навыкамі сістэматычнай працы і самакантролю на працягу семестра. Традыцыйная сістэма ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў, якая базуецца на выніковым кантролі ў форме экзамену ці заліку, не спрые фарміраванню і развіццю гэтых навыкаў. Вырашыць праблему дапамагае рэйтынгавая сістэма ацэнкі паспяховасці, «якая ўяўляе сабой інтэгральную ацэнку вынікаў усіх відаў дзейнасці студэнта за семестравы перыяд навучання па якой-небудзь дысцыпліне» [1].

Пры планаванні дзейнасці мы зыходзілі з таго, што «рэйтынгавая сістэма ацэнкі паспяховасці студэнтаў заснавана на выкарыстанні сукупнасці кантрольных кропак, аптымальна размешчаных на ўсім часавым інтэрвале вывучэння дысцыпліны. Пры гэтым прадугледжваецца раздзяленне ўсяго курса на шэраг больш ці менш самастойных, лагічна завершаных блокаў і модуляў і правядзенне па іх кантрольных акцый» [2, с.2]. Такім чынам, нашай задачай пры выкладанні дысцыпліны стала распрацоўка такіх блокаў і выбар аптымальных форм кантролю ведаў на кожным часава-тэматычным адрэзку вывучэння дысцыпліны.

Праграма дысцыпліны прадугледжвае практычнае паўтарэнне звестак па ўсіх раздзелах сучаснай беларускай мовы. Таму колькасць праверачных работ суадносіцца з колькасцю вывучаемых раздзелаў мовазнаўства. Акрамя таго, у курсе «Практыкума» запланаваны разгляд патрабаванняў арфаграфічнага рэжыму і пытанняў культуры маўлення. Практычным прымяненнем ведання арфаграфічнага рэжыму стала работа над памылкамі і афармленне вучэбнай дакументацыі,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

за што студэнты таксама атрымалі заліковыя адзнакі. Гадзін на правядзенне заняткаў па культуры маўлення праграмай не прадугледжана, таму на працягу семестра студэнты выступалі з вуснымі паведамленнямі па каляндарных святах (па 2-3 на кожных занятках).

Зводная табліца відаў і форм кантролю пры вывучэнні дысцыпліны «Практыкум па беларускай мове» выглядае наступным чынам:

| Практычныя заняткі | Змест | Уводны кантроль | Тэматычны кантроль | Бягучы кантроль | | Выніковы кантроль |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Уводзіны | Дыктант | | | | |
| 2 | Лексікалогія, фразеалогія, лексікаграфія | | | Работа над памылкамі | Вусныя паведамленні па каляндарных святах | |
| 3 | | | Складанне слоўнікаў | | | |
| 4 | | | | | | |
| 5 | Фанетыка, арфаэпія | | | | | |
| 6 | | | Слоўнікавы дыктант | | | |
| 7 | Арфаграфія | | | | | |
| 8 | | | Арфаграфічны тэст | | | |
| 9 | Марфалогія | | | Дамашняе заданне | | |
| 10 | | | | | | |
| 11 | | | Пераклад словазлучэнняў | | | |
| 12 | Сінтаксіс, пунктуацыя | | | | | |
| 13 | | | | | | |
| 14 | | | Дыктант | | | |
| 15 | Стылі б/м | | | Работа над памылкамі, вядзенне сшыткаў | | |
| 16 | Падагульненне | | | | | Залік |

Замест прапанаваных вучэбным планам чатырох абавязковых кантрольных мерапрыемстваў студэнты паўдзельнічалі ў не менш як дзесяці, што павысіла інтэнсіўнасць іх самастойнай працы па прадмеце.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выбар форм тэматычнага кантролю абумоўлены характарам і аб'ёмам практычнага матэрыялу, выкарыстанага на занятках. Абраныя формы (тэст, дыктант, пераклад, вуснае выказванне, лексікаграфічны эксперымент) прадэманстравалі ўзровень сфарміраванасці розных маўленчых уменняў першакурснікаў.

Такім чынам, выкарыстанне элементаў рэйтынгавай сістэмы ацэнкі паспяховасці дазволіла нам:

- стымуляваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў шляхам паэтапнай ацэнкі розных відаў работ на працягу ўсяго семестра;
- кіраваць самастойнай работай студэнтаў па прадмеце;
- вызначыць рэальны ўзровень падрыхтаванасці студэнтаў.

Наступным крокам па выкарыстанні рэйтынгавай сістэмы пры выкладанні прадмета «Практыкум па беларускай мове» нам бачыцца распрацоўка вучэбных модуляў па асобных частках курсу і ўдасканаленне сістэмы ацэньвання дзейнасці студэнтаў, што будзе спрыяць паляпшэнню якасці засваення матэрыялу, павышэнню матывацыі студэнта да сістэмнай працы ў працэсе атрымання ведаў.

## Літаратура

1. Положение о рейтинговой системе оценки знаний, умений и навыков студентов в УО «Белорусский государственный экономический университет» (БГЭУ). Мінск, 2007. – Рэжым доступу: http://www.bseu.by/russian/student/reyting.htm. – Дата доступу: 27.11.2007.

2. Положение о рейтинговой системе оценки знаний студентов ИАТЭ. Обнінск, 2007. – Рэжым доступу: http://www.iate.obninsk.ru/priemka/abitur.php?id_part=8. – Дата доступу: 27.11.2007.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова